DOI 10.24249/2309-9917-2023-57-1-56-65

*М.М. Хмяльніцкі (Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

## Идейно-художественное своеобразие социальных романов Адама Плуга [Ідэйна-мастацкая адметнасць сацыяльных раманаў Адама Плуга]

*Аннотация*: В статье исследуется идейно-художественная и жанровая специфика романов Адама Плуга («Дух и кровь», «Официалист» и «Бакалавры») с учетом социокультурного контекста, основных тенденций в польской литературе 1860–1870-х гг. Произведения писателя рассматриваются через призму теории социального романа Е.З. Цыбенко («изображение среды, быта отдельных социальных слоев, их взаимоотношений», «характерные типы», «широкое полотно жизни общества», «бытовая картинка» и др.). Выявлены факторы, которые обусловили идейно-художественное своеобразие социальных романов А. Плуга: позитивизм, общественно-исторические события, хронотоп, система образов, синтез романтизма и реализма, интерьер, язык, пейзаж.

*Ключевые слова*: социальный роман, позитивизм, польская литература, романтизм, реализм, жанр, персонаж, пограничье

---

*M.M. Khmialnitski (Minsk, Republic of Belarus)*

## The Ideological and Artistic Identity of Social Novels by Adam Pług

*Abstract:* The article examines the ideological, artistic and genre specificity of Adam Pług's novels ("Duch i krew", "Oficjalista" and "Bakałarze") considering the socio-cultural context, the main Polish literature trends of the 1860s and 1970s. The works of the writer are examined from the view of E.Z. Tsybenko's social novel theory ("environment depiction, individual social life, their relationships", "characteristic types", "the overview of social life", "home picture", etc.). The article reveals the factors, which determined the ideological and artistic identity of the social novels by Adam Pług: positivism, social and historical events, chronatope, system of images, synthesis of romantism and realism, interior, language, scenery.

*Key words:* social novel, positivism, Polish literature, romantism, realism, genre, character, borderland

Пры рэтраспектыўным аналізе мастацкага матэрыялу нярэдка мяняюцца неаспрэчныя раней крытэрыі і гісторыкам літаратуры даводзіцца ўзгадваць і пісьменнікаў далёка не першага плана, якія часта ў сваіх творах зазіралі наперад у спосабе адлюстравання рэчаіснасці, паказе чалавека і грамадства, стваралі глебу для

будучага росквіту тых ці іншых жанраў. Увага да творчасці такіх аўтараў дазваляе ўзнавіць літаратурны працэс ва ўсёй яго шматстайнасці, убачыць у ім спецыфічнае, а таксама засведчыць дыялектыку разнастайных з'яў і падзей у прыгожым пісьменстве той ці іншай краіны.

У кантэксце сказанага вышэй паказальнай падаецца творчая спадчына Адама Плуга (Adam Pług, 1823–1903) – польскага і беларускага пісьменніка, які амаль невядомы сучаснаму чытачу і ўсё яшчэ як след недаацэнены спецыялістамі-даследчыкамі ў гісторыі літаратуры Польшчы другой паловы XIX стагоддзя. Творчасць А. Плуга, прадстаўніка другога пакалення польскіх рамантыкаў, з'яўляецца ў пэўным сэнсе з'явай пераходнага перыяду, бо засведчыла змену мастацкіх парадыгм – ад рамантызму да рэалізму. Як трапна заўважыла І. Мацяеўская, «пры чытанні раманаў Плуга і падобных да яго аўтараў, якія стварылі аснову для творчасці Ажэшка, пераконваешся, наколькі бясконца вялікая праца папярэднічала нараджэнню вялікай рэалістычнай прозы»[1]. Падобнай думкі прытрымліваецца і А. Мальдзіс, сцвярджаючы наступнае: «Раманы і аповесці Плуга ў многім падрыхтавалі глебу для прозы польскага крытычнага рэалізму другой паловы XIX стагоддзя»[2]. Пачаўшы з твораў, у якіх выключная роля ў справе маральнага ўдасканалення чалавека і грамадства адводзілася рэлігіі і асвеце, А. Плуг у 1850–1860-я гг. паступова падыходзіць да рэалістычнай канцэпцыі свету і герояў, якую вызначае, з аднаго боку, наяўнасць каларытных замалёвак жыцця тагачасных Беларусі, Украіны і Польшчы, а з другога – прысутнасць элементаў асветніцкага рэалізму.

Асаблівае месца ў спадчыне А. Плуга займае раманная творчасць: з 1859 па 1863 г. выходзіць асобнай кнігай першы раман пісьменніка «Дух і кроў» («Duch i krew»)[3], а таксама два тамы «Поўнага збору твораў» у Жытоміры (серыя 1)[4] і Вільні (серыя 2)[5]. Пасля вызвалення з турмы (1866 г.) ён друкуе ў часопісе «Каласы» («Kłosy») раманы «Афіцыяліст» («Oficjalista») і «Бакалаўры» («Bakałarze», незавершаны). А. Плуг займеў папулярнасць у тагачаснага чытача перш за ўсё як празаік, творы якога засведчылі нарастанне рэалістычных тэндэнцый, што стала адметнай рысай польскай літаратуры сярэдзіны і другой паловы XIX стагоддзя. «Да Варшавы, – як слушна адзначыў Ю. Тувім, – Плуг прыбыў ужо як <…> аўтар паўсюдна вядомых раманаў "Афіцыяліст" і "Бакалаўры"»[6].

Пры разглядзе ідэйна-мастакай спецыфікі раманнай спадчыны А. Плуга мы звернемся да фундаментальнай працы А.З. Цыбенка «Польский социальный роман 40–70-х годов XIX века»[7], якая не страціла сваёй каштоўнасці для літаратуразнаўцаў-паланістаў па сёння, бо дапамагае ўбачыць гэтую з'яву ў станаўленні і развіцці, нацыянальнай адметнасці і тыпалагічнай суаднесенасці, цеснай сувязі з рэалістычным раманам, яго канцэпцыяй героя і свету. А.З. Цыбенка як праніклівы і дасведчаны літаратуразнавец звяртаецца да твораў не толькі вядомых шырокаму колу чытачоў польскіх празаікаў (Ю.І. Крашэўскі, Э. Ажэшка, Б. Прус і інш.), але і менш знаных тагачасных аўтараў (Ю. Кажанеўскі, Я. Лям, А. Плуг і інш.). У працэсе даследавання мы будзем абапірацца на асноўныя тэарэтычныя палажэнні і катэгорыі, вызначаныя і абгрунтаваныя А.З. Цыбенка ў дачыненні да польскага сацыяльнага рамана XIX стагоддзя: «прынцып сацыяльнай тыпізацыі»,

[1] *Maciejewska J.* Sylwetka literacka Adama Pługa // Pamiętnik Literacki. 1958. T.49. Z.1. S. 19.
[2] *Мальдзіс А.* Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мінск, 1969. С. 80.
[3] *Pług A.* Duch i krew: Kilka zarysów z życia towarzyskiego. Wilno, 1859. 304 s.
[4] *Pług A.* Zupełny zbiór pism. Seria I. Żytomierz, 1862. 310 s.
[5] *Pług A.* Zupełny zbiór pism. Seria II. Wilno, 1863. 334 s.
[6] Księga wierszy polskich XIX wieku: W 3 t. T.2. Warszawa, 1956. S. 286.
[7] *Цыбенко Е.З.* Польский социальный роман 40–70-х годов XIX века. М., 1971. 358 с.

«адлюстраванне асяроддзя, быту асобных сацыяльных слаёў, іх узаемастасункі», «характэрныя тыпы», «сацыяльны дэтэрмінізм», «шырокае палатно жыцця сучаснага пісьменніку грамадства», «мясцовыя сацыяльныя адносіны», «жывапісанне жанравых сцэнак і тыпаў», «бытавыя замалёўкі» і інш. А.З. Цыбенка шматаспектна ахарактарызавала асноўныя шляхі развіцця, праблематыку і жанравую адметнасць сацыяльнага рамана ў польскай літаратуры 40–70-х гг. XIX стагоддзя з улікам тагачаснага гісторыка-літаратурнага працэсу і сацыякультурнага кантэксту. Дадзеныя напрацоўкі – грунтоўная навуковая база і для разгляду раманнай творчасці А. Плуга.

Пачатак новага этапу ў гісторыі польскай літаратуры быў цесна звязаны з паўстаннем 1863 г., асэнсаванне характару і наступстваў якога склала яе асноўны праблемна-тэматычны дыяпазон. Пачынае выразна мяняцца грамадска-палітычная і эканамічная сітуацыя ў краіне. А, як вядома, літаратура самым непасрэдным чынам рэагуе на магістральныя змены ў соцыуме, імкнучыся зафіксаваць і прааналізаваць іх. І калі ў перыяд нацыянальна-вызваленчага руху пошукі і рэалізацыя грамадскага ідэалу былі звязаны самым непасрэдным чынам з поспехамі ва ўзброенай барацьбе, то пасля паўстання ён пачаў атаясамлівацца з прагрэсам польскай асветы, навукі, культуры і прамысловасці. На першы план выходзяць грамадскія праблемы, патрабуючы свайго неадкладнага адлюстравання і асэнсавання ў літаратуры і мастацтве.

Новая сацыяльная сітуацыя і актуальныя літаратурныя задачы адсунулі прыгожае пісьменства рамантызму на другі план. Заняпад рамантычнай эстэтыкі выклікаў змены ва ўсёй тагачаснай родава-жанравай сістэме: калі да 1863 г. галоўнае значэнне для польскага чытача мелі паэзія і драма, то пасля паражэння паўстання – ва ўсёй сваёй шматграннасці проза. У гэты перыяд канцэпцыя літаратуры вызначалася ў значнай ступені ўплывам пазітывісцкай ідэалогіі – у плане яе практычнага замацавання, а таксама пошукаў шляхоў грамадскага паразумення і грамадзянскага супрацоўніцтва дзеля росквіту краіны. Вырашэнню гэтых задач і павінна была служыць польская літаратура на чале з тэндэнцыйным раманам, у якім зыходная думка як ідэя-тэзіс станавілася цэнтрам, што аб’ядноўваў твор структурна і канцэптуальна; на яго раскрыццё павінны былі працаваць усе кампаненты твора. У гэтым кантэксце А. Плуг стаў адным з пачынальнікаў новай плыні ў польскай прозе другой паловы XIX стагоддзя, якую адрознівалі нацыянальная ангажаванасць, выразны сацыяльны дыскурс, актуальная маральна-этычная праблематыка і тэндэнцыя да рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці.

Аналізуючы раманы А. Плуга, трэба мець на ўвазе тое, што гэты пісьменнік не з’яўляўся абсалютным прыхільнікам ідэалогіі пазітывістаў, а яго творы не былі механічным адлюстраваннем яе асноўных ідэйна-эстэтычных палажэнняў. «Элементы традыцыйнасці, – як слушна даводзіць С. Буркат, – у Плуга былі глыбока звязаны з патрыятычнымі клопатамі пра лёс народа, перапляталіся з вострымі атакамі на “клерыкалаў” усялякі раз, калі праціўнікі хацелі выкарыстаць у канкурэнтнай барацьбе яго залежнасць ад Левенталя. Характэрнай з’яўляецца таксама абарона ім Канапніцкай ад атак клерыкальнай прэсы... Ва ўсім астатнім Плуг прэзэнтуе тып даўняга ліберала, які неахвотна прымаў змены ў грамадскай свядомасці, што імкнулася сцвердзіць генерацыя пазітывістаў»[1].

[1] *Burkot S.* Spory o powieść w polskiej krytyce literackiej XIX w. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1968. S. 164.

Раман «Дух і кроў» стаў першай спробай практычнай рэалізацыі ідэйна-мастацкіх пошукаў пісьменніка, яго стаўлення да праблем сучаснасці. А. Плуг задумаў стварыць шырокую панараму паўсядзённага жыцця шляхецкіх засценкаў, дзе ў асноўным і знаходзіў сваіх герояў. Вынікам гэтага з'явілася тое, што ў рамане «Дух і кроў» праблемны стрыжань склалі ў асноўным маральныя і сацыяльныя акцэнты, сутнасць якіх раскрываецца ў маналогах і дыялогах персанажаў твора, разгорнутых аўтарскіх разважаннях і каментарыях.

Час дзеяння ў «Духу і крыві» пазначаны А. Плугам дастаткова дакладна – гэта 1850-я гг. Відаць, сам пісьменнік лічыў, што такая храналагічная дакладнасць у сукупнасці з іншымі канкрэтна-гістарычнымі маркерамі надасць яго твору большую пераканаўчасць. Месца мастацкага дзеяння – польска-ўкраінска-беларускае памежжа. Менавіта тут, у розных маёнтках, сядзібах, вёсках і іх ваколіцах, разгортваюцца асноўныя падзеі ў рамане А. Плуга «Дух і кроў», які ў цэлым праўдзіва зафіксаваў тагачаснае сацыяльна-эканамічнае жыццё і маральна-псіхалагічную атмасферу на паўднёва-ўсходніх «крэсах» Польшчы. Са старонак твора паўстае цэлая галерэя каларытных вобразаў арыстакратыі, шляхты і сялянства.

Багуміл – галоўны герой рамана А. Плуга, выхадзец са збяднелай шляхты – імкнецца сцвердзіць натуральнае права чалавека на прызнанне яго не па іерархічным становішчы ў грамадстве, а па духоўна-душэўных вартасцях, прафесійных здольнасцях. Гэтая лінія становіцца ў «Духу і крыві» галоўнай, а вакол яе групуюцца ўсе астатнія: праблемы сям'і, «бацькоў і дзяцей», мастацтва, асветы, чалавечых узаемаадносін. Для таго каб падкрэсліць менавіта гэтую думку як асноўную, А. Плуг неаднойчы звяртаецца да цытавання Біблії. Ужо эпіграф да рамана: «I dał im moc stać się synami Bożymi, tym którzy wierzą w Imię Jego, którzy nie ze krwi, ani z woli ciała, ani z woli męza, ale z Boga się narodzili»[1], – з'яўляецца свайго роду каментарыем да загалоўка і рыхтуе чытача да адпаведнага ўспрымання зместу твора. Галоўны герой, абараняючы правы сялян і беднай шляхты, сцвярджае: «Шляхецтва павінна быць з духу, а не з крыві», «Золата і ў попеле відаць – часцей пад сялянскай тоўстай сярмягай б'е больш шляхетнае сэрца, чым пад батыставай кашуляй»[2].

Пісьменнік, зыходзячы менавіта з такога тэзіса, папракае найперш арыстакратыю за яе індэферэнтнасць у адносінах да народа, за пакланенне іншаземнаму мастацтву і непрыняцце айчыннага (напрыклад, госці дома пані харунжай са з'едлівай іроніяй слухаюць музычныя творы С. Манюшкі) і шляхту з яе каставымі забабонамі і звычаямі. А. Плуг бачыў прызначэнне пісьменніка, найперш, у служэнні краіне і грамадству, а функцыю літаратуры – у выхаванні і адукацыі народа. Таму аўтар і ставіць у цэнтр рамана інтэлігента шляхецкага паходжання, які, на яго думку, павінен стаць генератарам сацыяльна карысных пачынанняў, а таксама мець давер у чытачоў.

Багуміл, разам з іншым героем – князем Мар'янам, робіць першыя крокі на грамадскай ніве: яны займаюцца выхаваннем і адукацыяй сялян і іх дзяцей, заклікаюць (і на ўласным прыкладзе гэта дэманструюць) да чалавечых адносін з сялянамі, імкнуцца «прышчапіць» новую сістэму вядзення сельскай гаспадаркі, распрацоўваюць ідэю гандлёвай рэформы. Але вынікі канкрэтнай рэалізацыі высокіх памкненняў герояў у рамане не паказаны. Аўтар дае толькі абрысы такой перабудовы, якая знойдзе пазней сваё ўвасабленне ў творчасці Г. Сянкевіча, Б. Пруса і Э. Ажэшка.

[1] *Pług A.* Duch i krew: Kilka zarysów z życia towarzyskiego. S. 1.
[2] Ibidem. S. 107.

Мастацкі метад А. Плуга ў «Духу і крыві» – гэта сінтэз рэалізму і рамантызму. Рэалістычны дыскурс прасочваецца, па-першае, у стратэгіі аўтара акцэнтаваць увагу на маральна-этычнай праблематыцы і сацыяльнай абумоўленасці ўчынкаў персанажаў, па-другое, у паказе тыповых умоў рэальнага побыту: паўсядзённыя клопаты шляхты, сялян, адметнасць іх традыцый і звычаяў, спецыфіка жыцця мясцовых памешчыкаў, жывапісныя сцэны кірмашу. Падкрэслім, што паказ апошніх асабліва ўдаваўся А. Плугу, менавіта ў іх адлюстраванні ён моцны як мастак.

Імкненне пісьменніка, чаго б гэта ні каштавала, зрабіць сваіх герояў шчаслівымі ў каханні, уключэнне ў сюжэтную лінію твора таямнічых і загадкавых падзей, нечаканых супадзенняў, сустрэч, стылёвая прыўзнятасць асобных сцэн – ад рамантызму. А ў перадачы душэўных перажыванняў герояў А. Плуг часам нават спалучае рамантычны і сентыментальны струмені.

Раман «Дух і кроў» не застаўся не заўважаным польскай крытыкай. Напрыклад, А. Бэм ухваліў А. Плуга за «шматразовае прызнанне ўсяго таго, што пацвярджае права духу, а права крыві забараняе»[1]. Э. Ажэшка, прачытаўшы гэты твор, знайшла шмат станоўчага ў яго мастацкай задуме і назвала «Дух і кроў» «адным з найпрыгажэйшых і найвыразнейшых тэндэнцыйна напісаных польскіх раманаў»[2].

Наступны раман Адама Плуга – «Афіцыяліст» – у пэўнай ступені з'явіўся крокам наперад. У цэнтры гэтага твора – фрагмент жыцця галоўнага героя Зыгмунта Відскага, які становіцца этапным у яго лёсе і прадвызначае апошні. Сюжэтна-кампазіцыйны бок рамана адрознівае храналагічная паслядоўнасць у адлюстраванні жыццёвых калізій герояў, прычым аўтар не хавае сваёй прысутнасці ў рамане. Кожнай з частак твора папярэднічае ўступ, які садзейнічае раскрыццю пісьменніцкай задумы. Ад імя аўтара вядзецца аповед са шматразовымі непасрэднымі зваротамі да чытача. У некаторых выпадках гэтыя адступленні дастаткова аб'ёмныя, знешне слаба звязаныя з ходам асноўнага дзеяння. У той жа час яны ўтрымліваюць каштоўныя звесткі, якія садзейнічаюць раскрыццю аўтарскай канцэпцыі героя і свету, вытлумачваюць і паглыбляюць ідэйны змест рамана.

Галоўны герой твора – шляхціц Зыгмунт Відскі – у сілу самых розных прычын быў вымушаны прадаць бацькоўскую сядзібу і пайсці працаваць эканомам (афіцыялістам); гісторыя шляхецкай сям'і пасля заняпаду яе маёнтка і гаспадаркі складае асноўную сюжэтную лінію твора. Апынуўшыся ў цяжкім матэрыяльным становішчы, малады Відскі накіроўваецца ў суседнюю губернію ў пошуках пасады афіцыяліста. Ён часта трапляе ў сітуацыі, якія прыніжаюць яго чалавечую годнасць, асабліва калі герой абмяркоўвае ўмовы сваёй будучай працы з багатымі і пыхлівымі арыстакратамі, міжволі ўспамінаючы тых людзей, якія ў свой час звярталіся да яго з аналагічнай просьбай. Толькі ў выніку шчаслівага супадзення Відскі знаходзіць новае месца працы ў аднаго багатага арыстакрата. Менавіта тут герой выяўляе свае гаспадарчыя здольнасці, дэманструе ўменне трымацца з гонарам, дабіваючыся такім чынам грамадскага прызнання і павагі да сябе. Дзеянне рамана часта пераносіцца з вёскі ў горад і наадварот, а гэта, падкрэслім, было для польскай літаратуры новай з'явай.

Відскі, па вялікаму рахунку, герой, які меў шмат прататыпаў у тагачасным жыцці. А так як чытачы другой паловы XIX стагоддзя ў Польшчы – гэта ў асноўным адукаваная шляхта, прадстаўнікі збяднелай буржуазіі, мяшчане і пэўная група рамеснікаў і сялян, якія былі пастаўлена ў цяжкія ўмовы барацьбы за штодзённае існа-

---

[1] *Bem A.* Piśma krytyczne. Warszawa, 1963. S. 47.
[2] Orzeszkowa, Sienkiewicz, Prus o literaturze. Warszawa, 1956. S. 28.

ванне, то яны хацелі бачыць у літаратуры перш за ўсё адлюстраванне свайго жыцця і яго аналіз, ацэнку ўсяго таго, што адбывалася навокал. І менавіта тое, што многія чытачы знайшлі ў рамане відавочную праекцыю свайго лёсу, калі прыходзілася мігрыраваць у пошуках працы, прыстасоўвацца да новых умоў жыцця, садзейнічала папулярнасці гэтага твора. І. Мацяеўская ў гэтай сувязі слушна заўважае: «Збядненне, разарэнне дробнай і сярэдняй шляхты – гэта адно з ключавых пытанняў рамана Плуга»[1]. Пісьменнік імкнуўся праўдзіва, знутры паказаць гэты працэс, выкарыстаўшы багаты ўласны досвед (страта А. Плугам вёскі Паток). Каб вырашыць дадзеную праблему, аўтар даводзіць, што прычына заключаецца не столькі ў асобных прадстаўніках арыстакратыі, колькі ў складанай тагачаснай грамадска-эканамічнай сітуацыі. Паказальнай у гэтым сэнсе з’яўляецца гутарка ў карчме, дзе збяднелыя шляхцічы па-народнаму трапна і цвяроза ацэньваюць агульны стан сучаснага ім жыцця, з веданнем справы абмяркоўваюць свае праблемы.

Чым жа была абумоўлена перавага менавіта такога ракурсу ў рамане А. Плуга «Афіцыяліст»? «Для развіцця польскага рамана на гэтым этапе, – слушна зазначае ў сваёй кнізе «Польскі сацыяльны раман 40–70-х гадоў XIX стагоддзя» А.З. Цыбенка, – характэрна больш пільная ўвага да сацыяльных праблем, перанос асноўнага цяжару з фабулы на сацыяльны фон, што сведчыла аб паглыбленні рэалізму ў параўнанні з папярэднім перыядам»[2]. У рамане прадстаўлена панарама гістарычных, сацыяльна-побытавых і этнакультурных падзей і рэалій. «Адам Плуг, у прыватнасці, меркаваў, – працягвае А. Цыбенка, – што ў яго рамане «Афіцыяліст» у цэнтры павінен быць характар галоўнага героя, але гэты характар не атрымаўся досыць яскравым, мы б нават сказалі, што не герой у гэтым рамане самае важнае і цікавае, а апісанне памешчыцкага асяродку, яго побыту, узаемаадносін са шматлікай праслойкай эканомаў, слуг і г.д.»[3]. Акцэнт у мастацкім пазнанні – з асобы на грамадскае асяроддзе – з’яўляецца істотнай праявай сацыяльнага дэтэрмінізму ў паказе пісьменнікамі чалавека канкрэтнай эпохі. Імкненне А. Плуга да рэалістычнасці ў адлюстраванні рэчаіснасці (малюнкі штодзённага жыцця і клопатаў шляхты, сялян) у значнай ступені вызначыла ідэйны змест і паэтыку яго раманаў.

Так, на старонках не толькі «Афіцыяліста», але і твораў іншых польскіх аўтараў, з’явіліся самыя розныя прадстаўнікі тагачаснага грамадства. Галерэя вобразаў арыстакратыі, заможнай і збяднелай шляхты, сялянства выразна вымалёўваецца на этнаграфічным фоне, які паказаны аўтарам дэтальна і самабытна, аднак глыбокі сацыяльны аналіз у творы амаль адсутнічае.

Стылёвая палітра ў рамане «Афіцыяліст» А. Плуга досыць багатая і разнастайная. Таямнічае, кантраснае, звязанае найперш з унутраным светам герояў гэтага твора, іх думкамі, рэфлексіямі, перадаецца сродкамі рамантычнага стылю. Падобны мастацкі аповед адрозніваецца прыўзнятасцю, эмацыянальнасцю, уключае параўнанні і метафары, экспрэсіўныя эпітэты. Рамантычным пафасам напоўнены многія ўнутраныя маналогі герояў.

Другі стылёвы пласт рамана «Афіцыяліст» А. Плуга звязаны з натуралістычным адлюстраваннем навакольнага свету: у спакойнай манеры вядзецца расповяд аб няўдалых спробах Зыгмунта Відскага ўладкавацца на працу, пра побыт і звычаі мясцовай шляхты і арыстакратыі. Гэтаму стылёваму дыскурсу ўласцівы прастата і яскравасць мовы, прадметная дакладнасць і аб’ектыўнасць.

---

[1] *Maciejewska J.* Sylwetka literacka Adama Pługa. S. 44.
[2] *Цыбенко Е.З.* Польский социальный роман 40–70-х годов XIX века. С. 266.
[3] Там жа. С. 272.

Праца над трэцім раманам «Бакалаўры» была асабліва напружанай для А. Плуга. Як падкрэсліваюць даследчыкі, у гісторыі часопіса «Калоссе» не здаралася такіх перапынкаў, з якімі друкаваўся на яго старонках менавіта гэты твор. Рэдакцыя тлумачыла такую затрымку чытачам тым, што публікацыі рамана перашкодзіла асабістая драма аўтара (хвароба, а пасля смерць яго жонкі). Акрамя таго, заўсёды патрабавальны да сваёй творчасці, А. Плуг не мог раўнадушна аднесціся да тых правак і перакрэсліванняў, якія ўносіла цэнзура ў раман (пра гэта сведчаць яго лісты да Ю.І. Крашэўскага, якія захоўваюцца ў бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта).

У цэнтры рамана «Бакалаўры» – настаўнік Ясь, які праходзіць цяжкі шлях маральных і матэрыяльных выпрабаванняў. А. Плуг паказвае свайго героя ў самых разнастайных жыццёвых сітуацыях, але малюе яго з нязменнымі сімпатыяй і спачуваннем, бо тут відавочнай з'яўляецца праекцыя на лёс аўтара твора. Характары, драматычныя падзеі і абставіны ў рамане абумоўлены ў значнай ступені сацыяльна-гістарычнымі фактарамі. Сваім жыццёвым лёсам і маральна-этычным кодэксам галоўны герой твора сцвярджае неабходнасць і значнасць існавання такой прафесійна-грамадскай праслойкі, як настаўніцтва.

Фактычна, раман «Бакалаўры» не толькі стаў лагічным працягам праблематыкі ранейшых твораў А. Плуга, але і адкрыў у польскай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя не вядомыя дагэтуль грані ў адлюстраванні характару новага героя і яго грамадскую абумоўленасць. Як і ў ранейшых творах, вобраз Яся вытрыманы ў двух планах: рэалістычным і рамантычным. Характарыстыка героя як пэўнага сацыяльнага тыпа, раскрыццё канфлікту асобы і асяроддзя, барацьба розных грамадскіх сіл, настойлівыя пошукі праўды – рэалістычны план адлюстравання. З іншага боку, у характары настаўніка дамінуюць узвышаныя пачуцці: чыстае і бескарыслівае каханне, альтруізм, эмпатыя, здольнасць адчуваць і ўспрымаць прыгажосць навакольнага свету. Нездарма ў дачыненні да героя аўтар выкарыстоўвае такія словы, як «чысты», «апостал». Аднак настаўнік Ясь перыядычна адчувае і душэўную дысгармонію, якая выклікана якраз грамадскай несправядлівасцю. А. Плуг не дэкларуе якасці героя, а выводзіць яго сутнасць, стварае чалавечы характар як адзінства агульнага, сацыяльна абагуленага і індывідуальнага. Менавіта такім чынам ствараецца дастаткова паўнакроўны мастацкі вобраз.

Раскрыццю герояў і іх характараў у рамане «Бакалаўры» спрыяе падрабязнае апісанне А. Плугам інтэр'ераў і экстэр'ераў, якія даюць магчымасць больш яскрава ўявіць побытавую спецыфіку жыцця ў правінцыі, ахарактарызаваць сацыяльны статус персанажаў. Рэчы і прадметы атачаюць герояў, вызначаючы іх матэрыяльныя памкненні і духоўныя прыярытэты. Наяўнасць разнастайных побытавых дэталей у кантэксце ўзаемадачыненняў з чалавекам спрыяе больш глыбокаму пранікненню ва ўнутраны свет герояў А. Плуга. Так, напрыклад, значную ролю ў рамане адыгрывае апісанне двух інтэр'ераў-локусаў – дома бацькоў галоўнага героя і пакоя будучага настаўніка.

Стыль рамана «Бакалаўры» становіцца больш разнастайным менавіта ў апошніх раздзелах твора, дзякуючы рухомай мяжы паміж аўтарскай мовай і ўнутранай мовай персанажа. Аўтар сочыць за ходам думак героя, па меры неабходнасці каменціруе іх. Апошняе, на наша меркаванне, з'яўляецца вынікам своеасаблівага пераадолення дэфіцыту псіхалагізму, што было характэрна для стадыі станаўлення і развіцця рэалізму ў польскай літаратуры.

Раманы «Афіцыяліст» і «Бакалаўры» звярнулі на сябе ўвагу даследчыка польскай літаратуры XIX стагоддзя П. Хмялёўскага, які адзначыў наступнае: «Сардэч-

насць, пачуццёвасць і пры гэтым яснае бачанне агульнай сітуацыі, прынамсі, ў пэўнай сферы, становяцца перавагай гэтых твораў, якія ўзніклі са шчырай думкі, а шырэй – імкнення ўбачыць паляпшэнне на ўсіх грамадскіх узроўнях, а менавіта ў тых, якія аўтар выбраў аб'ектам сваёй увагі, – афіцыялістаў і педагогаў <…>. Аднак запаволены ход дзеяння, слабасць кампазіцыйнай будовы, якія з'яўляюцца суцэльным недахопам нашай раманістыкі, тут набываюць выразныя рысы»[1]. А Дэатыма (Ядвіга Лушчэўская) назвала гэтыя тры раманы Плуга своеасаблівай «сацыяльнай трылогіяй» і вызначыла галоўныя, на яе думку, вартасці твораў: «Багаты вобраз падольскай прыроды, дасканала намаляваныя чалавечыя пачуцці і пакуты, праўдзіва паказаныя розныя пласты грамадства, з неабходнай раўнавагаю іх станоўчых і адмоўных якасцей, рыс... мова чыстая, як раса»[2].

Кампазіцыйныя прынцыпы ў «трылогіі» А. Плуга абумоўлены ў значнай ступені тым, што пісьменніка цікавіць духоўны свет чалавека, які апынуўся пад уплывам не столькі нейкіх канкрэтных падзей, колькі таго грамадскага ладу, звычаяў, традыцый, што фарміраваліся стагоддзямі і з-пад якіх ён імкнецца амаль беспаспяхова вызваліцца. У выніку гэтага сюжэт адыгрывае адносна невялікую ролю ў творах, затое значны цяжар кладзецца на пазасюжэтныя сродкі мастацкага апавядання: скрупулёзнае ўзнаўленне генеалогіі галоўных герояў («Бакалаўры»), грамадскіх і гістарычных падзей і фактаў, якія з ёй звязаны («Дух і кроў»), партрэтныя характарыстыкі, дэтальнае апісанне побыту, хатняй абстаноўкі, што займае важнае месца ў мастацкім свеце твораў («Афіцыяліст»).

«Сацыяльную трылогію» А. Плуга аб'ядноўвае важная асаблівасць: у аснове кожнага з іх ляжыць біяграфія пэўнай сям'і, з якой і паходзіць галоўны герой, дзякуючы чаму гэтыя раманы набываюць рысы сямейнай сагі. Прычым, па сваёй ідэйна-мастацкай сутнасці галоўны герой – станоўчы і амаль заўсёды перамагае ў сваім сцвярджэнні на грамадскай ніве; імкнецца рэфармаваць свет, змяніць у лепшы бок чалавечыя ўзаемаадносіны, усталяваныя ў грамадстве парадкі і паказаць карысць гэтых змен непасрэдна на ўласным прыкладзе. У канструяванні героя і сюжэтных калізій значную ролю ў творах Плуга адыгрываюць рамантычныя элементы, што не садзейнічала сацыяльнай дэтэрмінацыі ўчынкаў і паводзін персанажаў.

А. Плуг у сваіх раманах часта звяртаецца да атмасферы таямнічага. Увогуле, вялікае значэнне ў развіцці сюжэта адыгрываюць выпадковыя сустрэчы (напрыклад, знаёмства Багуміла і князя Мар'яна ў «Духу і крыві», князя Атаназія ў «Афіцыялісту», Яся-вучня з сябрам ягонага бацькі ў «Бакалаўрах»), незвычайныя выпадкі (знаходка грошай Відскім), матыў раскрыцця тайны нараджэння (Багусі ў «Духу і крыві»). Аўтар не прэтэндуе ў сваіх раманах на глыбокі псіхалагізм. Ён часцей абмяжоўваецца знешнім партрэтам і перадачай маральных перакананняў герояў, толькі зрэдку спрабуе прааналізаваць іх унутраны стан, даць ім больш-менш разгорнутую псіхалагічную абмалёўку – а гэта ўжо быў бы досыць выразны крок да рэалізму. «Сапраўднага майстэрства ў спалучэнні сацыяльнага і псіхалагічнага аналізу польскія раманісты дасягнуць толькі ў 80-я гады ("Лялька" Б. Пруса)[3]» – слушна заўважае Е.А. Цыбенка.

Яшчэ адна асаблівасць раманаў А. Плуга – гэта яскрава прысутны рэгіяналізм, які выявіўся перш за ўсё у выбары месца дзеяння (пераважна –украінска-польска-беларускае памежжа) і ў мове персанажаў (украінскія і беларускія словы і

[1] *Chmielowski P.* Zarys najnowszej literatury polskiej. Kraków, 1895. S. 241.
[2] *Deotyma.* Adam Pług – Antoni Pietkiewicz // Biesiada Literacka. 1903. T.56. №43. S. 330.
[3] *Цыбенко Е.З.* Польский социальный роман 40–70-х годов XIX века. С. 272.

выразы, напрыклад: «Хіцёр Зміцер, ды і Кузьма не дурань», «Як мядок-саладок на стале, то й размова весялей», «Пустая лыжка горла дзярэ», «Рада б душа да раю, ды грахі не пускаюць», «Гара з гарою не сыходзяцца, а чалавек з чалавекам – ай, ай, ай!» і шмат іншых). Так, у рамане «Дух і кроў» мы можам налічыць у адным раздзеле больш за дваццаць народных выслоўяў беларускага і ўкраінскага паходжання. Але яны не ствараюць уражання залішнасці, непатрэбнасці, бо арганічна прысутнічаюць у самім тэксце, карэлююць з задумай аўтара, працуюць на вырашэнне галоўнай ідэі твора. І суддзя Гарбузок, адзін з цікавейшых персанажаў аповесці «Споведзь» А. Плуга, і Зазулевіч – герой яго рамана «Дух і кроў», як людзі бывалыя, любяць ажыўляць сваё маўленне прыказкамі і прымаўкамі, якія арганічна ўплецены ў аповед. Трапныя моўныя звароты, выкрышталізаваныя з фальклору, літаральна перасыпаюць мастацкі тэкст і надаюць яму самабытнае гучанне.

Важную эстэтычную і сэнсавую ролю ў раманах выконвае пейзаж. Ён з'яўляецца істотным складнікам кампазіцыі, фонам, на якім адбываецца мастацкае дзеянне. Карціны прыроды ў сацыяльных раманах А. Плуга ўзмацняюць прыкметы рэалістычнага апавядання, дапамагаюць характарыстыцы герояў, раскрываюць неабыякавае стаўленне аўтара да родных краявідаў у розныя поры года (зімовы пейзаж, летнія замалёўкі, восеньскія эцюды і інш.).

Як слушна падкрэсліла А.З. Цыбенка, «па характары канфлікту большасць польскіх раманаў 1860–1870-х гг. можна вызначаць як сацыяльна-пабытавыя. Як правіла, вялікае месца ў іх займаюць апісанні быту, асяроддзя, прасторы, дзе працякае дзеянне»[1]. Такая мастацкая асаблівасць у значнай ступені была ўласціва і раманам А. Плуга. Многія старонкі яго твораў адведзены шматаспектнаму апісанню фальваркаў, панскіх сядзіб і арыстакратычных палацаў, паглыбленню ў пабытавыя дэталі, род дзейнасці і паўсядзённыя клопаты розных слаёў грамадства. Менавіта дадзены аспект з'яўляецца найбольш удалым у творах А. Плуга, што наблізіла яго ў значнай ступені да рэалістычнай тэхнікі пісьма. Канкрэтна-гістарычны фон раманаў (на якім была відавочнай і некаторая ідэалізацыя герояў – перадавых прадстаўнікоў шляхты), акрэсленасць аўтарскай пазіцыі, дэмакратычных сімпатый пісьменніка зрабілі яго прозу ў пэўнай ступені наватарскай з'явай у польскай літаратуры сярэдзіны і другой паловы XIX стагоддзя, праўдзівым і пераканаўчым тэкстам аб сацыяльна-гістарычнай сітуацыі у гэты перыяд.

Такім чынам, раманная творчасць Адама Плуга рэпрэзентуе мастацка-эстэтычны працэс ўзаемадзеяння дзвюх літаратурных (рамантычнай і рэалістычнай) традыцый, з'яўляецца сведчаннем таго, як новыя мастацкія тэндэнцыі пракладвалі шлях у тагачаснай польскай прозе. А. Плуг, намаляваўшы ў сваіх творах дастаткова праўдзівую карціну жыцця дробнай і сярэдняй шляхты, арыстакратыі, пераканаўча раскрыўшы іх характары, асаблівасці побыту, звычаяў, мовы, адыграў значную ролю ў развіцці польскага сацыяльнага і станаўленні рэалістычнага рамана 1860–1870-х гг.

## ЛІТАРАТУРА

*Мальдзіс А.* Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мінск: Народная асвета, 1969. 164 с.

*Цыбенко Е.З.* Польский социальный роман 40–70-х годов XIX века. М.: Изд-во Моск. ун-та, 1971. 358 с.

*Вет А.* Piśma krytyczne. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1963. 350 s.

[1] Там жа. С. 266.

*Burkot S.* Spory o powieść w polskiej krytyce literackiej XIX w. Wrocław; Warszawa; Kraków: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1968. 170 s.

*Chmielowski P.* Zarys najnowszej literatury polskiej. Kraków: G. Gebethner i Spółka, 1895. 484 s.

*Deotyma.* Adam Pług – Antoni Pietkiewicz // Biesiada Literacka. 1903. T. 56. № 43. S. 330.

Księga wierszy polskich XIX wieku: W 3 t. / Opr. J. Tuwim. T. 2. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1956. 624 s.

*Maciejewska J.* Sylwetka literacka Adama Pługa // Pamiętnik Literacki. 1958. T. 49. Z. 1. S. 17–48.

Orzeszkowa, Sienkiewicz, Prus o literaturze. Warszawa: Czytelnik, 1956. 471 s.

*Pług A.* Duch i krew: Kilka zarysów z życia towarzyskiego. Wilno: Nakładem i Drukiem Józefa Zawadzkiego, 1859. 304 s.

*Pług A.* Zupełny zbiór pism. Seria I. Żytomierz: Nakładem autora, 1862. 310 s.

*Pług A.* Zupełny zbiór pism. Seria II. Wilno: Nakładem i Drukiem A.H. Kirkora, 1863. 334 s.

## REFERENCES

Maldzis A. (1969) Journey to the 19th century. Minsk. Narodnaja Aswieta Publ. 164 p.

Tsybenko E.Z. (1971) Polish Social Novel of the 40–70s of the 19th century. Moscow State University Press. 358 p.

Bem A. (1963) Piśma krytyczne. Warszawa. Państwowy Instytut Wydawniczy. 350 s.

Burkot S. (1968) Spory o powieść w polskiej krytyce literackiej XIX w. Wrocław; Warszawa; Kraków. Zakład Narodowy im. Ossolińskich. 170 s.

Chmielowski P. (1895) Zarys najnowszej literatury polskiej. Kraków. G. Gebethner i Spółka. 484 s.

Deotyma. Adam Pług – Antoni Pietkiewicz. *Biesiada Literacka.* 1903. T. 56. No 43, s. 330.

Księga wierszy polskich XIX wieku: W 3 t. / Opr. J. Tuwim. T. 2. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy. 1956. 624 s.

*Maciejewska J.* Sylwetka literacka Adama Pługa. *Pamiętnik Literacki.* 1958. T. 49. Z. 1, ss. 17–48.

Orzeszkowa, Sienkiewicz, Prus o literaturze. Warszawa. Czytelnik. 1956. 471 s.

Pług A. (1859) Duch i krew: Kilka zarysów z życia towarzyskiego. Wilno. Nakładem i Drukiem Józefa Zawadzkiego. 304 s.

Pług A. (1862) Zupełny zbiór pism. Seria I. Żytomierz. Nakładem autora. 310 s.

Pług A. (1863) Zupełny zbiór pism. Seria II. Wilno. Nakładem i Drukiem A.H. Kirkora. 334 s.

*Сведения об авторе*:

| Николай Николаевич Хмельницкий, | Mikalai Khmialnitski, |
| --- | --- |
| доктор филол. наук | Doctor of Philology |
| доцент | Associate Professor |
| филологический факультет | Philological Faculty |
| Белорусский государственный университет | Belarusian State University |

KhmelnickiNN@bsu.by